***Праверце сябе.*** 1. Чаму геаграфічныя даследаванні Беларусі падзяляюцца на тры этапы? 2. У якіх гарадах і калі пачалі праводзіцца назіранні на метэастанцыях і гідрапастах? 3. Як уплывае на геаграфічныя даследаванні развіццё інфармацыйных тэхналогій?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму на першым этапе найбольшых поспехаў дасягнулі даследаванні ў галіне картаграфіі? 2. Якое значэнне для развіцця геаграфіі Беларусі мелі экспедыцыі першага этапу? 3. Якую практычную накіраванасць маглі б мець даследаванні вашага рэгіёна?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Па картах атласа знайдзіце каналы і складзіце кароткія паведамленні пра іх будаўніцтва. 2. Падрыхтуйце паведамленне пра градусныя вымярэнні дугі мерыдыяна (Дугі Струвэ) і дугі паралелі, праведзеныя на пачатку XIX ст. пад кіраўніцтвам К. І. Тэнера. 3. Падрыхтуйце прэзентацыі пра навуковыя дасягненні беларускіх географаў на даваенным і сучасным этапах.

## § 4. Геаграфічныя назвы

***Успомніце.*** *Якія назвы геаграфічных аб’ектаў сваёй мясцовасці вы ведаеце? Успомніце цікавыя назвы геаграфічных аб’ектаў.*

**1. Тапаніміка.** З даўніх часоў людзей цікавіла паходжанне назваў геаграфічных аб’ектаў, таму што кожная з іх мае пэўны сэнс. Сваё адлюстраванне ў назвах знайшлі асаблівасці прыродных кампанентаў, гісторыя фарміравання тэрыторыі, кірункі гаспадарчай дзейнасці. Цяпер у Беларусі налічваецца 200 гарадскіх паселішчаў, каля 23 000 сельскіх населеных пунктаў, каля 21 000 рэк і ручаёў, каля 11 000 азёр і вадасховішчаў, сотні формаў рэльефу, радовішчаў карысных выкапняў, вуліц і плошчаў, іншых геаграфічных аб’ектаў. І ўсе яны маюць свой пэўны адрас у выглядзе геаграфічнага імя. А колькі назваў геаграфічных аб’ектаў не з’яўляюцца афіцыйнымі і захоўваюцца толькі ў памяці мясцовых жыхароў!

Фарміраванне назваў ішло на працягу доўгага часу. На тэрыторыі нашай краіны жылі розныя этнічныя групы, што адбілася ў беларускіх тапонімах. Шмат назваў пакінулі славянскія і балцкія плямёны, ёсць аб’екты з назвамі цюркскага паходжання. Як вы думаеце, чаму менавіта гэтыя этнасы паўплывалі на фарміраванне геаграфічных назваў?

Растлумачыць паходжанне назваў геаграфічных аб’ектаў дапамагае тапаніміка. Аб’ектам вывучэння гэтай навукі з’яўляюцца геаграфічныя назвы, ці тапонімы. Да найбольшых груп тапонімаў адносяцца айконімы,


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**ТАПОНІМЫ**

| Айконімы | Гідронімы | Аронімы |
|---|---|---|
| назвы населеных пунктаў | назвы рэк, азёр, вадасховішчаў | назвы формаў рэльефу |








Мал. 11. Групы тапонімаў

гідронімы і аронімы (мал. 11). Да айконімаў (грэч. *oikos* — ‘жыллё’) адносяцца назвы населеных пунктаў, да гідронімаў (грэч. *hydor* — ‘вада’) — рэк, азёр, да аронімаў (грэч. *oros* — ‘гара’) — формаў рэльефу. Па агульнай колькасці ў Беларусі найбольшае распаўсюджанне атрымалі гідронімы і айконімы.

**Тапаніміка** — навука, якая займаецца вывучэннем паходжання, значэння і распаўсюджвання назваў геаграфічных аб’ектаў.

**2. Група назваў рэк і азёр.** Першымі на тэрыторыі Беларусі з’явіліся гідронімы — назвы рэк. Ёсць розныя версіі паходжання гідронімаў.

Чаму гідронімы з’явіліся ў Беларусі першымі?

Часта назвы рэк звязаны з характарам цячэння і берагоў. Напрыклад, аснова назваў рэк Свіслач, Іслач азначае ‘разліў, вільготнасць’. Значэнне назвы ракі Піна — ‘прыпынак’ — звязана з павольным цячэннем ракі, Случ — ‘звілісты характар рэчышча’. Велічыню рэк падкрэсліваюць назвы Вілія (ад славянскага — ‘вялікая’), Друць (ад літ. *drutas* — ‘шырокая’), Шчара (ад балт. *saras* — ‘вузкая’).

Многія гідронімы адлюстроўваюць велічыню і форму азёр: Доўгае, Крывое, Круглае (мал. 12).




Мал. 12. Адлюстраванне формаў азёр у назвах

З глыбінёй, колерам донных адкладаў звязаны назвы азёр Глубля, Белае, Чорнае, Чырвонае. Пра характар берагоў кажуць назвы азёр Асвейскае (развеяны пясок на берагах), Дрывяты (топкія берагі, «дрыгва»). Назвы некаторых азёр сустракаюцца па некалькі разоў. Напрыклад, больш за 40 азёр Беларусі маюць назву Белае, каля 30 — Чорнае. Вялікая колькасць гідронімаў Беларусі звязана з назвамі жывёл і раслін.

Знайдзіце на карце атласа (с. 6–7) па 3–5 рэк і азёр, назвы якіх звязаны з назвамі жывёл і раслін.

**3. Група назваў населеных пунктаў**. На фарміраванне геаграфічных назваў паселішчаў Беларусі паўплывалі прыродны, гістарычны, этнічны і лінгвістычны фактары. Група айконімаў, якія адлюстроўваюць асаблівасці прыродных умоў Беларусі, ахоплівае больш за 20 % назваў населеных пунктаў (Бяроза, Крыніца, Дуброўка і інш.). Вялікая група айконімаў звязана з гістарычнымі падзеямі, з умовамі жыцця і працы насельніцтва ў розныя часы (Баяры, Засценак, Дружылавічы). Фарміраванне беларускай народнасці абумовіла з'яўленне назваў населеных пунктаў, звязаных з этнічнымі групамі насельніцтва (Літва, Ляхі, Швабы, Татаршчына). З лінгвістычным фактарам звязана трансфармацыя назваў. Напрыклад, пад уплывам польскай мовы змяніліся назвы Бярэсце — Брэст, Горадня — Гродна, Крулеўшчына — Круляўшчызна і інш.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Чаму ў Беларусі шмат айконімаў звязана з земляробствам?

Цэлы пласт айконімаў сфарміраваўся на падставе земляробчай тэматыкі. Да гэтай групы адносяцца назвы населеных пунктаў Чысць, Доры, Карчоўе, Ляда, Пасека. Невялікія ўчасткі ворнай зямлі сярод лесу абумовілі ўзнікненне назваў Палянка, Астравец. Пасля страты ўрадлівасці асвойваўся новы ўчастак, так з'явіліся назвы Старына, Навінкі і інш. Асваенне ўрадлівых глеб, занятых рознымі тыпамі лясоў, прывяло да з'яўлення такіх назваў, як Дуброўна, Бярозаўка, Ліпаўка, Ельск, Асінаўка. Вялікія плошчы хваёвых лясоў абумовілі шырокае распаўсюджанне такіх тапонімаў, як Сосны, Баравое, Бараўляны і інш. З назвамі раслін і жывёл звязаны айконімы Альшаны, Баравікі, Бабруйск, Жабінка, Дзятлава, Барсукі і інш.

Лясы, балоты, азёры, рэкі і элементы рэльефу часта служылі арыенцірамі на мясцовасці. Гэта дало аснову назвам населеных пунктаў Залессе, Забалацце, Зарэчча, Каменная Горка, Лоск. З месцазнаходжаннем і знешнім абліччам населеных пунктаў звязаны тапонімы Круглае, Крайск, Дальнавічы, Прудок, Паплавы.

Шмат назваў з'явілася пасля правядзення зямельнай рэформы ў ВКЛ у XVI ст. Сярод іх панскія сядзібы з гучнымі назвамі Палац, Вялікі Двор, Белы Двор і сельскія паселішчы Навасёлкі, Прысады. Невялікія паселішчы, звязаныя з надзеламі зямлі, атрымалі назвы Куты, Кліны, Шнуры. Як вы думаеце, ці можна да гэтай групы аднесці айконімы Гарадок, Навагрудак, Пагост, Слабада? Чым абумоўлены іх назвы?

Вялікая група назваў сведчыць пра род заняткаў насельніцтва. У лясах сяліліся лесарубы і прамыслоўцы, так з'явіліся назвы Стан, Ловы, Шатрышча. У залежнасці ад віду заняткаў узніклі Бортнікі (пчаліная гаспадарка), Плытнікі (сплаў лесу), Бандары (выраб бочак), Ганчары (гліняны посуд), Гута (металургічны або шкляны завод), Рудня (месца здабычы жалезнай руды), Паперня (папяровая фабрыка), Смольня (смалакурня) і інш. Да гэтай групы адносяцца таксама назвы Млынок, Кавалі, Канюхі, Агароднікі.

Асаблівасці транспартных шляхоў адлюстроўваюць назвы Масты, Старыя Дарогі, Перабродзе. Пра старажытны водны шлях «з варагаў у грэкі» сведчаць назвы паселішчаў Валок, Пярэвалакі. Зручныя для прыпынку месцы на рэках далі назвы населеным пунктам Чырвоны Бераг, Свержань (цвёрдае месца каля ракі). Распаўсюджаны і айконімы з гідранімічнай асновай. Яны паходзяць ад назваў рэк: Полацк (р. Палата), Віцебск (р. Віцьба), Пінск (р. Піна), Слуцк (р. Случ).

Вялікая група айконімаў пайшла ад асабістых імён заснавальнікаў і ўладальнікаў паселішчаў. Да іх адносяцца гарады Барысаў, Мсціслаў, Іванава, Клімавічы, Васілевічы, вёскі Мікалаеўшчына, Захараўка і інш.

Асобную групу айконімаў утвараюць геаграфічныя назвы савецкага часу: Акцябрскі, Першамайскі, Салігорск, Светлагорск.

Некаторыя населеныя пункты былі перайменаваны ў савецкі час. Замест горада Койданава з'явіўся Дзяржынск, пасёлка Качэрычы — горад Кіраўск. Назвы гарадоў Ігумен і Прапойск былі заменены на Чэрвень і Слаўгарад. Усяго з 1918 г. было перайменавана больш як 450 населеных пунктаў. Чым абумоўлена з'яўленне новых назваў?

**Падвядзём вынікі.** Тапонімы падзяляюцца на тры асноўныя групы: айконімы, гідронімы і аронімы. На фарміраванне геаграфічных назваў Беларусі паўплывалі прыродны, гістарычны, этнічны і лінгвістычны фактары. Больш за 20 % тапонімаў адлюстроўваюць асаблівасці прыродных умоў.

***Праверце сябе.*** 1. На якія асноўныя групы падзяляюцца тапонімы Беларусі? 2. Чаму назвы некаторых азёр сустракаюцца па некалькі разоў? 3. Прывядзіце прыклады гідронімаў: а) звязаных з асаблівасцямі берагоў і цячэння рэк, б) якія адлюстроўваюць велічыню і форму азёр. 4. Якія фактары паўплывалі на фарміраванне айконімаў Беларусі?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Знайдзіце на картах атласа гідронімы, звязаныя з назвамі жывёл і раслін. 2. З якімі групамі тапонімаў звязана паходжанне назваў узвышшаў, раўнін і нізін Беларусі? 3. Растлумачце назвы свайго населенага пункта, раённага і абласнога цэнтраў, бліжэйшых рэк і азёр.

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Складзіце тапанімічную картасхему гідронімаў Беларусі. 2. З дапамогай карт атласа распрацуйце слоўнік тапонімаў сваёй вобласці або раёна.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне